**А. Марозава**

# ЛІНГВАКУЛЬТУРНЫ КАНЦЭПТ “СКВАПНАСЦЬ” У ПАРЭМІЯЛОГІІ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ

Лінгвакультурны канцэпт – гэта распаўсюджаны на ментальным узроўні элемент культуры. Ён узнікае як вынік чалавечай дзейнасці і працэсаў пазнання свету.

Своеасаблівай крыніцай інфармацыі пра культуру народа з’яўляецца парэміялагічны і фразеалагічны фонды яго нацыянальнай мовы.

Мэтай даследавання было вылучыць канцэптуальныя прыметы лінгвакультурнага канцэпту “сквапнасць”. Для рэалізацыі мэты ставіліся наступныя задачы: выявіць лекічныя сродкі, якія рэпрэзентуюць названы канцэпт; выбраць корпус беларускіх фразеалагізмаў і парэмій з гэтымі сродкамі; вылучыць і сістэматызаваць канцэптуальныя прыметы.

Фактычным матэрыялам даследавання паслужылі 15 фразеалагізмаў з “Фразеалагічнага слоўніка беларускай мовы” І. Я. Лепешева і 62 парэміі са слоўніка “Прыказкі і прымаўкі” Акадэміі навук Беларускай ССР.

Было вылучына 10 груп моўных адзінак, якія адлюстроўваюць сувязь канцэпта “сквапнасць” з такімі паняццямі, як

- ‘багацце’ (*чым багацей, тым скупей; хто болей мае, той яшчэ жадае)*;
- ‘рэлігійнасць’: (*хціві і бога прадаў бы; дай чорту адзін волас, дык ён усю галаву* возьме);
- *вяліка; есць, як у прорву, да больш жадае)*;
- ‘сумленне’(*дзеля дарагатові і бацьку прадаць гатовы; накладваць лапу (руку)*;
- ‘дробязнасць’ (*як за грош задавіцца гатоў; скупы і з камара кроў высмакча)*;
- ‘добразычлівасць’ і ‘гаспадарлівасць’ (*у яго з сваім хлебам паабедаеш; нож тупы – гаспадар скупы)*;
- ‘старасць’(*скупыя паміраюць, а дзеці сундукі адкрываюць*);
- ‘справядлівасць’ (*скупому два разы баліць; скупому вечная згуба)*;
- ‘розум’ (*хто скуп, сабе не глуп; хто скупы, той глупы)*;
- ‘марнатраўства’ (*лепш скупавата, чым матавата).*

Такім чынам, канцэпт “сквапнасць” звязаны ў беларускай лінгвакультурнай прасторы з хрысціянскай традыцыяй і гістарычнай з’явай сацыяльнага расслаення.